## ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНЫЯ ГРУПЫ МІКРАТАПОНІМАЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ

*Г.К. Семянькова*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Мікратапонімы (неафіцыйныя назвы лясоў, балот, палёў, лугоў, дарог, ручаёў, мастоў, студняў, частак населеных пунктаў і іншых дробных геаграфічных аб’ектаў), як вядома, непасрэдна звязаны з жыццём і дзейнасцю чалавека: у іх захоўваюцца звесткі пра заняткі жыхароў пэўнай мясцовасці ў мінулым, асаблівасці паселішчаў, жывёльнага і расліннага свету.

Нягледзячы на пэўную ўвагу навукоўцаў да мікратапонімаў, асобныя рэгіёны Беларусі (у тым ліку і Віцебшчына) застаюцца недастаткова даследаванымі. Названыя неафіцыйныя адзінкі бытуюць у вуснай мове, нідзе не кадыфікуюцца, таму існуе верагоднасць іх бясследнага знікнення. Пагэтаму важнай задачай з’яўляецца збор і захаванне багатага мікратапанімнага матэрыялу, у якім адлюстроўваюцца маўленчыя рысы людзей, факты гісторыі, асаблівасці жыццёвага ўкладу і светаўспрымання чалавека, яго творчыя здольнасці і інш. У сувязі са сказаным актуальнасць прапанаванага артыкула ўяўляецца нам відавочнай.

Мэта артыкула – выяўленне і апісанне лексіка-семантычных груп мікратапонімаў Віцебшчыны.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужылі прыклады (агульная колькасць – больш за 150 адзінак), сабраныя ў палявых умовах у 2010–2019 гг. Выкарыстаны апісальны метад даследавання.

**Вынікі і абмеркаванне.** Мікратапонімы дастаткова разнастайныя і багатыя паводле семантычных прыкмет, пакладзеных у іх аснову: найменні ўзыходзяць да антрапонімаў, геаграфічных тэрмінаў, назваў расліннага і жывёльнага свету, іншых лексіка-семантычных груп апелятыўнай лексікі.

Частымі з’яўляюцца прыклады, у аснову якіх пакладзены мужчынскія або жаночыя ўласныя асабовыя імёны: ***Арынін*** *двор* (падвор’е гасцініцы, у якой гаспадарыць жанчына па імені *Арына*), ***Мар’ін*** *вір* (вір, у якім патанула *Марыя*), ***Цітава*** *Лыжка* (былая сядзіба Ціта, месца, дзе зліваюцца два ручаі, якія контурамі нагадваюць форму лыжкі), ***Дзямідаўшчына*** (поле, былы хутар *Дзяміда*), ***Мікітава*** *поле* (поле, якое ўся вёска адбівала ад агню падчас пахавання аднавяскоўца *Мікіты*), ***Фядотава*** *Касá* (поле, былы хутар *Фядота*), ***Яшкіна*** *поле* (поле, якое кааператар *Яшка* ўзяў у арэнду) і інш.

Пры ўтварэнні ад прозвішчаў нярэдка выкарыстоўваецца прадуктыўны ў мікратапаніміі фармант -*шчына*: ***Аўтухоўшчына*** (сад, які раней належыў пану *Аўтухову*), ***Карнілаўшчына*** (поле, былы хутар *Карнілава*), ***Сувораўшчына*** (урочышча, былы хутар пана *Суворава*), ***Мажнéўшчына*** (поле, былая сядзіба *Мажнёва*). Адпрозвішчнымі з’яўляюцца таксама найменні ***Зуеў*** *Асіннік* (алея; калісьці чалавек па прозвішчы *Зуеў* пазабіваў у зямлю асінавыя калы для агароджы, якія пазней прыжыліся), ***Баброва*** *мясціна* (бераг ракі, на якім пасяліўся Васіль *Бяброў*), ***Смалякова*** *сядзіба* (месца, дзе жыў *Смалякоў*), ***Тарбулінцы*** (поле, былая сядзіба пана *Тарбуліна*), ***Марозава*** (поле, былая сядзіба пана *Марозава*), ***Мéжава*** (парк, які належыў пану Межаўскаму) і інш.

У аснове мікратапоніма можа назірацца мянушка: ***Гапуліна*** *імшышча* (балота, на якім аднойчы заблудзілася бабуля *Гапуля*), ***Зуева*** *Свечка* (месца, дзе раней стаяў млын, гаспадаром якога быў чалавек па мянушцы *Зуй* – руплівы селянін, што працаваў нават ноччу пры свечках), ***Караліхіна*** *гара* (узвышша, былая сядзіба *Караліхі*), ***Каштанава*** *кладбішча* (могілкі, назва ўтворана ад мянушкі першага пахаванага – *Каштан*), ***Ваўчкоў*** *ручэй* (ручай побач з дваром *Ваўчка*).

Нярэдкімі з’яўляюцца мікратапонімы, у аснову якіх пакладзены назвы людзей па сацыяльным становішчы: ***Панскі*** *ручэй* (ручай, побач з якім жыў пан), ***Панскі*** *Сад* (поле, на месцы якога раней быў панскі сад), ***Панская*** *Усадзьба* (поле, былы хутар пана). З прыкладаў відаць, што ў такіх адзінках выкарыстоўваецца прыметнік, які ўказвае на прыналежнасць сада, сядзібы, сажалкі камусьці (у прыведзеных найменнях пану).

На ўсёй тэрыторыі Віцебшчыны распаўсюджаны мікратапонімы, што паходзяць ад айконімаў (як правіла, назваў вёсак). Такія найменні могуць называць лес або яго частку: ***Высокаўскі*** *Парк* (лес побач з вёскай *Высокае*), ***Гáдаўскі*** *лес* (лес побач з вёскай *Гадавічы*),



Репозиторий ВГУ

***Ку́раўская*** *паляна* (паляна побач з вёскай *Кураўшчына*), ***Селякці́нец*** (лес побач з вёскай *Селякто*), ***Хаміны'*** (лес, месца былой вёскі *Хаміны*), ***Храпуно́ўскі*** *Мох* (лес побач з вёскай *Храпуны*), поле або ўрочышча: ***Ка́менцы*** (поле, месца былой вёскі *Каменцы*), ***Ку́раўшчыннае*** *по́ле* (поле побач з вёскай *Кураўшчына*), ***Тата́рскія*** (урочышча, месца былой вёскі *Татарскія*), ***Шаўры'*** (поле побач з вёскай *Шаўры*), гідрааб'ект: ***Абухоўскае*** *балота* (балота побач з вёскай *Абухава*), ***Ку́раўшчыннае*** (рыбнік у вёсцы *Кураўшчына*), ***Селякця'нка*** (ручай у вёсцы *Селякто*). Значна радзей такія найменні называюць нізіну: ***Ю'рцаўскі*** *Басейн* (нізіна побач з вёскай *Юрцава*), частку вёскі: ***Ба́бін*** *Лоб* (частка вёскі *Бабіна*), мост: ***Пішчалаўскі*** *мост* (мост побач з вёскай *Пішчалава*), могілкі: ***Спа́саўскае*** *кладбішча* (могілкі каля вёскі *Спасава*).

Значную па колькасці групу ўтвараюць мікратапонімы, утвораныя ад апелятываў, што характарызуюць асаблівасці мясцовасці: ***Вятроўка*** (вялікае (5х5 км) поле, на якім заўсёды дзьме моцны вецер), ***Камні*** (пераход, брод на рэчцы, дзе дно выслана камянямі), ***Лысая*** *гара* (узвышша, на якім зараз мала дрэў), ***Патопа*** (нізіна, якая вясной заліваецца вадою), ***Пескавацік*** (пляж, бераг з дробным пяском), ***Цямніцы*** (балота, зарослае высокім хмызняком і нізкімі вербамі, таму тут заўсёды цёмна), ***Чорная*** *Лужа* (частка лесу, бруднае месца), ***Чорная*** *цясніна* (балота, дзе дрэвы растуць вельмі густа, цесна), ***Гарэлае*** *Балота* (поле, былое выгаралае балота), ***Чорнае*** (лес, былы выгалалы тарфянік), ***Пагарэлішча*** (поле, выгаралы бор).

Частымі з'яўляюцца мікратапонімы, што называюць былы аб'ект: ***Аэрадром*** (поле, былы запасны аэрадром), ***Базар*** (плошча, былы базар), ***Брыкетніца*** (поле, на якім стаяла машына для сушкі торфу), ***Замак*** (частка берага, на якой, паводле легенды, стаяў княжацкі замак), ***Кар'ер*** (сажалка, былы кар'ер), ***Мосцікі*** (частка берага возера, уздоўж якой некалі былі мосцікі для паласкання бялізны), ***Мыльня*** (месца, у цэнтры якога раней стаяла лазня), ***Спіртоўшчына*** (месца, дзе стаяў спіртзавод), ***Сталоўшчына*** (месца, дзе стаяла сталоўка). Прыведзеныя і падобныя на іх мікратапонімы захоўваюць звесткі, якія могуць быць не вядомы жыхарам населенага пункта, а таму з'яўляюцца надзвычай каштоўнымі для ведання гісторыі, шляхоў развіцця краю, тлумачэння працэсаў, што адбываюцца на пэўнай тэрыторыі.

У мікратапаніміі Віцебшчыны назіраецца значная колькасць назваў-арыенціраў: ***За горкай, За возерам, За балотам, За лесам*** і інш.

**Заключэнне.** Такім чынам, для Віцебшчыны характэрна разнастайнасць лексіка-семантычных груп мікратапонімаў. Базай для ўтварэння мікратапонімаў служаць агульнаўжывальныя апелятывы, розныя віды і формы антрапанімных адзінак (у тым ліку мянушкі, неафіцыйныя формы ўласных асабовых імён), часам дыялектная і размоўная лексіка. Змены ў рэльефе, гістарычныя падзеі могуць прыводзяць да таго, што страчваецца сувязь паміж назвай і аб'ектам называння. У такім выпадку неафіцыйныя найменні лясоў, балот, палёў, лугоў, дарог, ручаёў, мастоў, студняў, частак населеных пунктаў і іншых дробных геаграфічных аб'ектаў утрымліваюць інфармацыю, якая на сучасным этапе не адпавядае рэчаіснасці. Для мікратапаніміі Віцебшчыны ўласціва перавага састаўных назваў над простымі.

## КОНЦЕНТРАЦИЯ ОСНОВНЫХ ТВОРЧЕСКИХ КАТЕГОРИЙ В РОМАНЕ ГАРОЛЬДА ПИНТЕРА «КАРЛИКИ»

*О.Ф. Сенькова*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

«Новая» волна социальных изменений середины XX века в английском обществе схлынула вместе с амбициями лейбористов, инициировавших ряд реформ в образовании и здравоохранении, и явившихся первопричиной в классовом и культурном перевороте в Великобритании середины XX века. Казалось бы, и новое поколение драматургов, потеряв основополагающую тему, отошло в историю, однако среди них были представители не столько «новой» волны, временно транслирующей идеи масс, сколько основоположники «новой драмы» – направления, отражающего сознание человека нового поколения.

Таким драматургом является Гарольд Пинтер (*Harold Pinter, 1930–2008*) – лауреат Нобелевской премии 2005 года, автор широкого спектра пьес, сценариев, скетчей. Представляется актуальным с позиций современного осмысления проанализировать основополагающие автор-



Репозиторий ВГУ